Гродзенская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма;
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка



# “У сэрцы маім – бацькоўскае імя”

да 70-годдзя з дня нараджэння Марыі Шаўчонак

**"У сэрцы маім – бацькоўскае імя": да 70-годдзя з дня нараджэння Марыі Сіланцьеўны Шаўчонак / Гродзенская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма; аддзел бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка; уклад. Н.С. Аўчыннік; рэд. Свірыда Н.Р., Ілюшына І.М.– Гродна.– 2014.– 24 с.**

*Выданне прысвечана творчасці гродзенскай паэткі Марыі Шаўчонак, якая ў 2014 годзе адзначае свой 70-гадовы юбілей. Ўключае біяграфічную даведку, бібліяграфію твораў Марыі Сіланцьеўны і літаратуры аб ёй, а таксама бібліяграфічны агляд кніг пісьменніцы.*

*Выданне будзе карысна бібліятэкарам, філолагам, а таксама ўсім, хто цікавіцца літаратурным жыццём Гродна.*

# Шаўчонак Марыя Сіланцьеўна



Нарадзілася пісьменніца 11 мая 1944 года ў вёсцы Новы Востраў Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям`і. У 1965 годзе скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Адзін навучальны год настаўнічала ў Ракавічах (Шчучынскага раён), а затым – больш дзесяці гадоў – на газетнай працы ў шчучынскай раёнцы (газета “Савецкая вёска”). З 1978 года – старшы рэдактар аддзела літаратурна-мастацкіх праграм Гродзенскай абласной студыі тэлебачання. Вяла праграмы “Спадчына”, “Крыніца народнай творчасці”, “Прынёманскія далягляды”. Узнагароджана медалём “За працоўную доблесць”.

Паэтэса, журналістка. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1979 года. Працавала ў выдавецтве Інстытута сучасных ведаў, у Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі (2001 – 2002 гг.). Лаўрэат прэміі імя А.І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама

“За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва ў 2005 годзе” ў намінацыі “Пісьменнік года”.

Першы верш “Я піянерка” надрукавала ў 1954 годзе ў газеце “Піянер Беларусі”. Друкавалася ў калектыўных зборніках “Рунь” (1964), “Краю мой Нёман” (1989), «Литклуб» (2006), у альманасе “Нябесны знак”, у рэспубліканскіх часопісах і газетах.

Выдала зборнікі вершаў “Белая ластаўка” (1971), “Свята зямлі” (1976), “Бацькоўскае імя” (1981), “Раса-расінка” (1985), “Белыя свечкі каштанаў” (2005), “Искорка сердца” (2006), “Озёрная святыня” (2009).

Укладальнік, заснавальнік і рэдактар альманаха “Нябесны знак”. Дыпламант конкурсу “Гэта мой горад”. Друкуецца ў перыядычным друку. Піша ў асноўным па-беларуску, але яе вершы пераведзены на рускую, латышскую, англійскую і іншыя мовы.

На вершы Марыі Шаўчонак напісана музыка кампазітарамі Л. Захлеўным, А. Маркелавым, І. Вераб`ёвым, М. Коппам, І. Кузняцовым.

# Літаратура аб жыцці і творчасці М. Шаўчонак


1. Карлюкевіч, А. У пошуках гарадзенскіх знакамітасцяў: [пра беларускіх пісьменнікаў Васіля Быкава, Дануту Бічэль-Загнетаву, Міхася Васілька, Юрку Голуба, Марыю Шаўчонак, Алеся Пяткевіча, Вольгу Іпатаву, Аляксея Карпюка] / А. Карлюкевіч // Карлюкевіч, А. Радзімазнаўства. Мясціны. Асобы: краязнаўчыя нарысы / Алесь Карлюкевіч. - Мінск, 2010. - С. 47-49.
2. Марыя Шаўчонак // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Кліч. раёна. - Мінск, 1995. - С. 440.
3. Марыя Шаўчонак // Пісьменнікі Савецкай Беларусі: карот. давед. - Мінск, 1981. - С. 374.
4. Пяткевіч, А.М. Паэзія пачуцця: [пра творчасць беларускай паэткі Марыі Шаўчонак] / А.М. Пяткевіч // Пяткевіч А.М. Старонкі спадчыны: культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з`явы, асобы / А.М. Пяткевіч. - Мінск, 2006. - С. 138-142.
5. Шаўчонак, Марыя Сіланцьеўна // Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліягр. паказ.- Магілёў, 1993. - С. 236.
6. Шаўчонак Марыя Сіланцьеўна // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. - Мн., 1987. - Т. 5. - С. 562.

1. Голуб, Ю. Сілавясны: [пра гарадзенскую паэтку М. Шаўчонак] / Ю. Голуб // Гродзенская праўда. - 2004. - 13 мая. - С. 6.

2. Гузень, А. Святло паэтычнай зоркі: [аб вечарыне ў АНМЦ з нагоды юбілею паэтэсы Марыі Шаўчонак] / А. Гузень // Гродзенская праўда. - 1999. - 10 чэрв. - С. 2.

3. ЛеГАЛ. "Купаются в лужице мелкой высокие небеса": [пра зборнік вершаў "Озёрная святыня" беларускай паэткі Марыі Шаўчонак ] / ЛеГАЛ // Літаратура і мастацтва. - 2010. - 23 крас. - С. 14.

4. Марціновіч, А. Кропля расы і Сусвет: [пра зборнікі Марыі Шаўчонак "Белая ластаўка" і "Искорка сердца»] / А. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. - 2008. - 18 ліп. - С. 7.

5. Марціновіч, А. "Я адкажу", "Зямная": творчасць М. Шаўчонак / А. Марціновіч // Работніца і сялянка. - 1981. - № 10. - С. 20-21.

6. Марыі Шаўчонак – 50 // Літаратура і мастацтва. - 1994. - № 20. - С. 12.

7. Міхальчык, С. Марыя Шаўчонак – пісьменнік года – 2005: [пра аднайменную кніжную выставу ў аддзеле краязнаўства ДУК "ГАНБ імя Я.Ф. Карскага", прысвечаную беларускай паэтцы Марыі Шаўчонак] / С. Міхальчык // Перспектива (Гродненский район). - 2006. - 17 янв. - С. 3.

8. Петкевич, А. Одухотворенность: [творчество М. Шевченок] / А. Петкевич // Гродненская правда. - 1986. - 9 янв.

9. Пяшко, І. “І ўсё ж іду ў новы бой…”: [пра гарадзенскую паэтку М. Шаўчонак] / І. Пяшко // Дзянніца (Шчуч. р-н). - 1999. - 13 лістап. - С. 2.

10. Самойла, Г. Пад белымі свечкамі каштанаў: [пра кнігу “Белыя свечкі каштанаў” гродзенскай паэткі Марыі Шаўчонак (Слонім, 2005)] / Г. Самойла // Літаратура і мастацтва. - 2006. - 18 жн. - С. 7.

11. Терменев, А. Гродна вячэрні запаліць агні…: [о книге “Белыясвечкікаштанаў” гродненской поэтессы Марии Шевченок (Слоним, 2005)] / А. Терменев // Вечерний Гродно. - 2006. - 11 янв. - С. 26.

12. Уладзімірава, А. “Зноўпа шчучынскіх вуліцах ціха блукаю і шукаю сябе ў сваім даўнім жыцці…”: [пра сустрэчу ў Шчуч. гар. бібліятэцы з паэтамі, членамі рэдкалегіі Гродзенскага літаратурна-мастацкага альманаха “Нябесны знак” – Марыяй Сіланцьеўнай Шаўчонак, Мікалаем Іванавічам Сяровым, Анатолем Уладзіміравічам Апанасевічам (бардам, скульптарам) – членам СПБ Чаславай Уладзіміраўнай Мулярчык і мясцовымі паэтамі, сярод якіх – Гвідон Іосіфавіч Ждановіч] / А. Уладзімірава // Дзянніца (Шчучынскі раён). - 2007. - 4 студ. - С. 3.

13. Чыгрын, С. Паэтка шукае слова: [пра кнігу “Белыя свечкі каштанаў” беларускай паэткі

Марыі Шаўчонак (Слонім, 2005)] / С. Чыгрын // Літаратура і мастацтва. - 2005. - 28 кастр. - С. 6.

14. Шевченок, М. Её небесное знамение: [интервью с гродненской поэтессой Марией Шевченок] / бесед. Тамара Мазур // Перспектива (Гродненский район). - 2010. - 20 янв. - С. 28.

15. Шрубейка, К. На высокай струне гадоў: [пра прэзентацыю кнігі “Белыя свечкі каштанаў” беларускай паэткі Марыі Шаўчонак у ДУК “ГАНБ імя Я. Карскага] / К. Шрубейка // Перспектива (Гродненский район). - 2005. - 20 дек. - С. 5.



# Выданні М. Шаўчонак




**Шаўчонак, М. Свята зямлі: вершы / М. Шаўчонак. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. - 80 с.**

**Шаўчонак, М. Бацькоўскае імя: вершы / Марыя Шаўчонак. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1981. - 62 с.**







**Шаўчонак, М. Раса-расінка: вершы / Марыя Шаўчонак. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. - 70 с.**




Шаўчонак, М.С. Белыя свечкі каштанаў: вершы / Марыя Сіланцьеўна Шаўчонак. - Слонім: Слонимская типография, 2005. - 168 с.




Шевчёнок, М.С. Искорка сердца: стихи / Мария Силантьевна Шевчёнок. - Слоним: Слонимская типография, 2006. - 148 с.




Шевчёнок, М.С. Озёрная святыня: стихи / Мария Силантьевна Шевчёнок. - Гродно: Гродненская типография, 2009. - 108 с.

# Публікацыі твораў М.Шаўчонак

- Шаўчонак, М. Алеся: [верш] / М. Шаўчонак // Алеся. - 2010. - №10. - С. 55.
- Шаўчонак, М. Нёман; М. Багдановічу; Сляды вякоў: [вершы] / М. Шаўчонак // Гродна ў вершах і песнях. - Гродна: Гродзенская друкарня, 2008. - С. 129-131.
- Шаўчонак, М. Памяці маці; Душа мая; Бацькаўшчына: [вершы] / М. Шаўчонак // Галасы. - 2002. - С. 116-117.
- Шаўчонак, М. Сляды вякоў: [верш] / М. Шаўчонак // Бацька наш Нёман. - Мінск: Юнацтва, 2001. - С. 416-417.
- Шаўчонак, М. Я тут жыву; На праменьчыку тонкім; Дамоў паеду; Фарэль; Суцяшэнне; Пакінуты хутар: [вершы] / М. Шаўчонак // На Нёманскай хвалі. - 2009. - №1. - С. 144-146.
- Шевченок, М. Альманах под звездами: [стихи] / М. Шевченок // Вечерний Гродно. - 2006. - 5 ліп. - С. 32.
- Шаўчонак, М. Гродна вячэрні; А Неман больш чым проста Неман; Шукаю золата; Роднаму гораду, У Беларусь буслы прынеслі: [вершы] // Вечерний Гродно. - 2006. - 11 янв. - С. 26.

- Шевченок, М. Искорка сердца; Печаль и радость: [стихи] / М. Шевченок // ЛитКлуб. Юбилейный выпуск. - 2004. - С. 59-62.
- Шевченок, М. К свету Вселенной: [стихотворения] / М. Шевченок // Нябесны знак. - №4. - С. 230-233.
- Шевченок, М. Мамин свет: стихи / М. Шевченок // Целитель (Гродно). - 2009. - №10. - С. 28.
- Шевченок, М. На берегу вселенной; Я настрою себя...; Доверься душе своей...: [стихи] // Гродзенская праўда. - 2008. - 3 мая. - С. 5.
- Шевченок, М. На руках у природы; Лесные этюды; Ласточки; Пожелания: [стихи] / М. Шевченок // Нябесны знак. - №6. - С. 193-197.
- Шевченок, М. Нота соль: [стихотворение] / Мария Шевченок // Целитель (Гродно). - 2014. - №1. - С. 46.
- Шевченок, М. Прощу обиду на судьбу...; Душа примирилась с телом...; Зеркало; И сжимает мне сердце опять; Цветок: [стихи] / М. Шевченок // Целитель. - 2006. - № 1. - С. 23.
- Шаўчонак, М. Сіла кветкі: [верш] / М. Шаўчонак // Гродзенская праўда. - 2012. - 3 сак. - С. 4.

# Песні на вершы М. Шаўчонак

- Шаўчонак, М. Белыя свечкі каштанаў: [песня] / сл. М. Шаўчонак; муз М. Копа // Гродна ў вершах і песнях: і памяць, і пашана, і любоў… / уклад.: Л.А. Кебіч, А.І. Ласмінскі. - Гродна: Гродзенская друкарня, 2008. - С. 160-161.
- Шаўчонак, М. Песня пра Гродна: [песня] / сл. М. Шаўчонак; муз. А. Маркелава // Гродна ў вершах і песнях: і памяць, і пашана, і любоў… / уклад.: Л.А. Кебіч, А.І. Ласмінскі. - Гродна: Гродзенская друкарня, 2008. - С. 204-205.
- Шаўчонак, М. Гродна вячэрні: [песня] / сл. М. Шаўчонак; муз. А. Маркелава // Гродна ў вершах і песнях: і памяць, і пашана, і любоў… / уклад.: Л.А. Кебіч, А.І. Ласмінскі. - Гродна: Гродзенская друкарня, 2008. - С. 214-215.



# Сакрэт паэтычнага слова М. Шаўчонак

## Бібліяграфічны агляд паэзіі

*Сакрэт паэтычнага слова*
*У чым заключаецца ён?*
*Ці ў тым, што для кожнага новы*
*І сэнс у яго, і закон?*

***М. Шаўчонак***

Сакрэт паэтычнага слова Марыі Шаўчонак, менавіта, у развітай паэтычай культуры верша і лірычным складзе таленту пісьменніцы. Чалавек, прырода, грамадства, мінулае і будучае – вось тая праблематыка, што знаходзіцца ў аснове твораў паэта. Многія лірычныя вершы Марыі Сіланцьеўны ўключаюць у сябе элегічна-філасофскія роздумы аб жыцці, хуткацечнасці часу, асмысляюць чалавечыя пакуты і радасці, страты і падзеі.

У сваe 70 год пісьменніца мае за плячыма шэсць зборнікаў паэзіі, у якіх роздум пра жыццё і каханне, чалавечнасць і дабрату, пераемнасць пакаленняў.

Паэтычны зборнік М. Шаўчонак **“Свята зямлі”** пабачыў свет ў 1976 годзе. Хараство

Прынёманскага краю, лірычная споведзь перад Бацькаўшчынай, каханне – асноўныя матывы зборніка паэтэсы. Маладосць, яе надзеі і мары, чысціня сэрца, вернасць роднай зямлі – тыя пласты жыцця, якія найлепш увасабляюцца яе паэтычным словам.

*Яшчэ з дзяцінства знаю я,–*
*Няма вясны без салаўя.*

*Без песняў не бывае свят.*
*Не расцвіце без сонца сад.*

*Не будзе шчасця без сяброў,*
*Не знойдзеш праўды без жыцця,*
*І да Зямлі сваёй любоў*
*Мацней любога пачуцця.*

(Яшчэ з дзяцінства знаю я…)

У гэтым зборніку перад чытачом прадстае паэтэса эмацыянальна адкрытага светаадчування, яна ўмее адгукацца на ўсё прыгожае, эстэтычна высокае.

***Свята зямлі***

*Ёсць непаўторныя імгненні,*
*Як неразгаданыя сны.*
*Стаю ў маўчанні і здзіўленні*
*На самым беразе вясны.*
*Вось сонца глянула з-за гаю,*
*Крыштальны дзень,*
*як мой настрой.*
*Яго, як радасць я прымаю,*
*І п`ю,*

*Як хмельных траў настой.*
*Ёсць святы розныя ў прыродзе,*
*І разам з ёй святкуем мы,*
*Калі ў сады вясна прыходзіць*
*І першы белы дзень зімы.*
*Святкуюць птушкі свае святы,*
*Ёсць святы ў дрэў,*
*ёсць святы ў рэк…*
*І харастном душа багата*
*І акрылёная – навек.*

Наступны зборнік Марыі Сіланьеўны **“Бацькоўскае імя”,** выйшаў у 1982 годзе ў выдавецтве “Мастацкая літаратура”. Зборнік гэты – новая справаздача перад чытачом.

Паэтэса раскрывае лірычны свет свайго сучасніка, яго імкненні заўсёды быць на ўзроўні часу. У новых вершах паэткі ўжо адчуваюцца літаратурная свядомасць, жыццёвая пэўнасць і трывалы грамадскі грунт пад нагамі. І ўпэўненасць гэту дае родная зямля, родная прырода.

*Яна мне дадзена адзіная*
*На ўсё жыццё, на цэлы век.*
*Мая адзіна, радзімая*
*Ў вянках лясоў і стужак рэк.*
*Заўсёды самая прыветная,*
*Як сонца, свеціцца сама,*
*Жыве, як мара запаветная,*
*І роўных ёй – нідзе няма.*

*Яе праменнямі сагрэтая,*
*Наліта сілай маладой,*
*Іду, нястомная, па свету я*
*Яе часцінкаю жывой.*

*І ганаруся ўсюды смела я,*
*Што вырасла на той зямлі,*
*Якую клічуць Руссю Белаю,*
*Што тут дзяды мае жылі.*

(“Мая Радзіма”)

Творы паэткі, прысвечаныя роднай зямлі, прыгожаму Прынёманскаму краю, сагрэты цеплынёй і пяшчотай, захапленнем бацькоўскай старонкай, хараством яе прыроды *(“Зямля мая”, “Свіцязь”, “Дажджы, дажды над Руссю Белай…”*).

Пашыраецца і дыяпазон выяўлення творчай асобы пісьменніцы, паэтка авалодвае новымі жанрава-стылёвымі і выяўленчымі мажлівасцямі.

Так у сваім новым зборніку Марыя Шаўчонак звяртаецца да адной з самых лірычных форм паэзіі - санету. У санетах *“Вясна – адна наўсіх”* узняты тэмы Вялікай Айчыннай вайны, адказнасці чалавека за будучае Зямлі і новых пакаленняў.

*На многія стагоддзі застаецца*
*Бацькоўскае, спрадвечнае, святое,*
*Іх сонца, і дыханне маладое,*
*Іх поўнае надзей шчаслівых сэрца.*
*Яно – над абеліскамі герояў,*
*Шуміць даспелым коласам на полі,*

*Яно не дасць спыніцца нам ніколі*
*Сярод дарог няпройдзеных сувояў –*
*У іх багацце наша і парывы.*
*Без бацькаўшчыны хто з нас быў шчаслівы?*

У працэсе творчага развіцця М. Шаўчонак становіцца больш лірычна глыбокаю, пачуццё яе напаўняецца аб`ёмным зместам. Такія змены ўнутраннага свету аўтара адчуваюцца ў зборніку **"Раса-расінка"**, пабачыўшаму свет у 1985 годзе. Паэтычнае тут ідзе побач з драматычным, высвятляючы складанасць жыцця, унутраных перажыванняў аўтара. Вершы пранікліва-шчырыя, поўныя ўзрушанага роздуму аб тым, што ўбачана і перажыта (*"Не давала мне сэрца спакою…", "На вякоў скрыжаваннях", "Развага"*).

*На той настрой сябе настрой,*
*Каб і начамі пасвятлела,*
*Каб не спрачацца нам з табой,–*
*Глядзець упэўнена і смела.*
*Пад сілу ўсё!*
*І толькі так!*
*Жыццё разгадвае загадкі,*
*А пакідае ўдачу знак,*
*Таму,*
*Хто верыць без аглядкі.*
("Развага")

У зборніку **"Белыя свечкі каштанаў"**(2005 год) перад чытачамі шырока разгарнуўся свет чалавечых пачуццяў і перажыванняў, шчырых

сумненняў і прызнанняў. Вельмі натуральна, арганічна прагучаў яе верш *"Я б не пісала вершаў, не"*, у якім пісьменніца дзеліцца з намі сваім душэўным вопытам, унутрынымі думкамі, перажываннямі. Адносіны да паэзіі ў Марыі Шаўчонак вызначаюцца маральнай чысціней і трываласцю поглядаў, глыбокай асэнсаванасцю свайго "я" у паэтычным свеце.

*Я б не пісала вершаў, не,*
*Калі б яны, жывыя, самі*
*Не напаўнялі сэрца мне*
*Хвалюючымі галасамі.*
*Я не пісала б вершаў, не,*
*І без мяне іх пішуць многа,*
*Але мільгаюць яны ў сне*
*То ціхай песняй, то трывогай.*
*І, дзіўна, з імі мне святлей,*
*Лягчэй ісці і бачыць мэту.*
*Жыві, мой верш, і сэрца грэй,*
*Будзь, як і мне, патрэбным свету!*

Паэт ва ўсім давяраецца жыццёваму і працоўнаму вопыту. Вобразы роднай зямлі ва ўспрыманні Марыі Сіланцьеўны набываюць паўнаважную паэтычную каштоўнасць *("Сляды вякоў", "Бацькаўшчына", "Не шкадуюць слоў высокіх")*. Яна імкнецца раскрыць радасць, боль зямнога быцця. У творах пра прыроду сустрэнем лірычны роздум, узрушаны жэст, жывую філасофскую думку.

Свет паэзіі Марыі Шаўчонак поўніцца трывожнымі думкамі пра родную зямлю, самаадчуванне на ёй чалавека (*“Зямля, як сэрца”, “Мой боль – Беларусь”, “На чысты на снег белакрылы”).*

Асаблівую заклапочанасць у паэта Марыі Шаўчонак выклікае праблема адносін грамадскасці да роднага слова, да роднай мовы, “мовы майго народа”. Заўседы было роднае слова прадметам асаблівай павагі, адзнакай высокай культуры і чалавечай годнасці.

*Беларускае слова – святое,крынічнае,*
*Найчысцейшае, найстаражытнае з моў.*
*Не загіне яно адгарэўшаю знічкаю,–*
*Душы продкаў ў ім і ад Бога любоў.*

(“Беларускае слова – святое”)

Наступныя два зборнікі паэта **“Искорка сердца”** (2006), **«Озёрная святыня»** (2009) выйшлі на рускай мове.

Як прызнаецца сама пісьменніца, вершы яна піша, колькі сябе памятае. Раней вершы прыходзілі на роднай беларускай мове. Але праца ў рэдакцыях газет і на тэлебачанні для вершаў амаль не пакідала часу, больш даводзілася пісаць артыкулы і сцэнары.

Зараз час у яе з'явіўся, але вершы чамусьці сталі пісацца даволі часта на рускай мове. Пэўную ролю адыграла пастаяннае двухмоўе ў рэспубліцы, а таксама якасць некаторых

перакладаў яе вершаў на рускую мову: пры перакладах заставаліся ад вершаў толькі падобныя на іх цені.

Вершы Марыі Шаўчонак на рускую мову перакладалі маскоўскія перакладчыкі Рыма Казакова, Слава Пайн, Анатоль Кулагін, з мінчан – Фёдар Яфімаў, Іосіф Васілеўскі і іншыя. У зборнік “Искорка сердца” увайшлі некаторыя пераклады, але іх меншая частка, і аўтар не вылучае іх асобна.

Вершы з апошніх зборнікаў умяшчаюць у сябе жывы свет мараў і памкненняў, радасць быцця і пакуты, боль сумлення. Яна ўмее размаўляць з сонцам і небам, чалавекам і цэлым народам, мінулым і будучыняй. Паэтэса знаходзіць надзвычай дакладныя надзённыя словы пра лёс краіны, стан нашага сённяшняга грамадства (*“Озёрная святыня”, “Гродненские колокола”, “Мне вернуться в родные края”).*

Аднымі з самых шчырых, пранікнёных і кранальных з'яўляюцца вершы, прысвечаны маці. Яны гучаць як споведзь, як малітва аб самым дарагім і светлым, што можа быць у жыцці чалавека. Маці. Яна – пачатак жыцця, ідэал чалавека, зберагальніца маральных каштоўнасцей (*“Маме” (“Искорка сердца”, 2006),“Стихи о маме” (“Озёрная святыня,2009)).*

*Всю красоту твою, мама,*
*Неповторимый твой свет…*
*Даже святыми словами*

*Это не выразить, нет.*

***

*Светом твоим я согрета,*
*Как ни темно на земле.*
*В небе ты лучиком где-то*
*Тянешься нежно ко мне.*

(«Стихи о маме»)

Адна з цэнтральных тэм лірыкі Марыі Шаўчонак - тэма кахання. Найвышэйшай праявай духоўнасці асобы, яе своеасаблівага азарэння з’яўляецца стан закаханасці. Здольнасць кахаць сведчыць пра багацце і шчырасць душы. Каханне – дарунак лёсу, знак Боскай волі *(“Твои слова”, “У лепестка есть только миг”, “Любовь – единственная ценность” (зб. “Искорка сердца”,2006); ”Недосказано что-то”, “Большие горы нарисую” (зб.“Озёрная святыня”, 2009).*

*Есть горе, есть боль и есть муки,*
*Скитанье, метанье, беда,*
*Но могут любимые руки*
*Все это забрать навсегда*

*Но может любимое сердце*
*Все это в себе уместить.*
*Любовь выше жизни и смерти*
*Для тех, кто умеет любить.*

*Восход и души озаренье*
*Всегда утверждает одно:*
*Любовь неземное творенье,*
*Но держит всю землю оно.*

(“Есть горе, есть боль и есть муки”)

Асабліва вылучаюцца ў зборніках “Искорка сердца”, “Озёрная святыня” вершы, прысвечаныя праблематыцы паэтычнага спасціжэння кароткачасовасці чалавечага жыцця і непазбежнасці смерці. Перажываннямі часу, спробай знайсці магчымасці прымірэння чалавека з няўмольным часам прасякнуты многія лірычныя творы паэткі *(“Годы земные”, “Зовут по отчеству…”,“Давно ли?” (“Искорка сердца”, 2006); “Спасибо, Господи”, “Придет однажды день…”, “Люди как волны” (“Озёрная святыня”, 2009).*

***Годы земные***

*Когда-то в прекрасный весенний рассвет*
*Кукушка опять и опять*
*Так много пророчила будущих лет,*
*Что было их не сосчитать.*

*И я не считала, я верила в то,*
*Что я на земле навсегда,*
*Что я здесь навечно, что я, как никто,*
*Останусь всегда молода.*

***

*И не избежать нам когда-то креста,*
*И знаем мы все – почему.*

*Но хочется времени бросить вослед:*
*– Зачем же торопишь опять?*
*Уже за плечами достаточно лет,*
*Достаточно, чтоб не считать!*

(“Искорка сердца”, 2009)

У паэтычных зборніках Марыі Шаўчонак ёсць самыя розныя акцэнты: барацьба дабра са злом, каханне і здрада, лёс роднай мовы і культуры. Яе цікавяць і чалавек у яго адвечным шляху ад нараджэння да смерці, і ягоныя думкі, і настрой, і дзівосны, непаўторны свет прыроды. Усё гэта, спалучанае з глыбокім веданнем жыцця, філасофскім светапоглядам і вялікай любоўю да людзей, надае творам пісьменніцы прыцягальнасць, эстэтычную выверанасць і актуальнасць. А спавядальнасць інтанацый, эмацыянальная ўсхваляванасць твораў, глыбіня інтуітыўна-пачуццёвага светаадчування і светапазнання знаходзяць самы шчыры водгук у сэрцах чытачоў, які не дае згаснуць “святлу паэтычнай зоркі пісьменніцы”.

***Не пакіну слядоў***
***І назад не вярнуся,***
***Сярод  многіх гадоў***
***Невідзімкай згублюся.***
***У імгненні крыла***
***Толькі слова ўвскрэсне:***
***Я заўсёды была***
***Неразлучнаю з песняй.***

**М. Шаўчонак**

